представителей межэтнического региона. Потребности такого рода представляют собой особые межиндивидуальные отношения и осуществляются посредством совместных действий, направленных на установку взаимоуважительных, а именно толерантных отношений, что и необходимо в условиях полиэтничного региона Пограничья.

*Список литературы*


1. Бабосов, Е. М. Белорусская модель этнокультурного развития // Философские проблемы бытия, познания, веры и культуры / Е. М. Бабосов. – Минск : РИВШ, 2010. – С. 164–175.
2. Беспамятных, Н. Н. Белорусско-польско-литовское пограничье: границы, культуры, идентичности / Н. Н. Беспамятных ; под науч. ред. проф. М. А. Можейко. – Минск : РИВШ, 2009. – 244 с.
3. Беспамятных, Н. Н. Границы и пограничья: подходы, понятия, перспективы / Н. Н. Беспамятных ; под науч. ред. проф. М. А. Можейко. – Минск : РИВШ, 2012. – 206 с.
4. Бобков, И. Этика Пограничья: транскультурность как белорусский опыт / И. Бобков // Перекрестки. – 2005. – № 3-4. – С. 34–42.
5. Титаренко, Л. Г. Теории пограничья / Л. Г. Титаренко [Электронный ресурс] – 2013 – Режим доступа : https://docplayer. ru/33747459-L-g-titarenko-teorii-pogranichya.html. – Дата доступа : 15.11.2019.
6. Донских, С. В. Пограничье как проблема современной белорусской науки / С. В. Донских // Народы, культуры и социальные процессы на пограничье : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 22-23 февраля 2010 г. – Гродно : ГрГУ, 2010. – С. 102–105.


***Татьяна Николаевна Боярчук***, Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, г. Гродно, Республика Беларусь.

**Tatyana Boyarchuk**
Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, The Republic of Belarus
e-mail: tboyar@grsu.by

SOCIO-CULTURAL CONSTRUCTION OF INTER-ETHNIC TOLERANCE UNDER CONDITIONS OF BORDERLAND

The article presents a philosophical analysis of the essence of sociocultural construction of interethnic tolerance in borderland conditions. The main methods of constructing interethnic tolerance in the formation of a regional model of dialogue and mutual understanding of ethnic cultures are revealed. The author considers the Borderland as a multicultural space, represented by the dichotomy of the interaction of «I» and the «Other», where it is impossible to know yourself without comparing your «I» with the «Other». The borderland is represented in the sociocultural aspect as a local region and a contact zone for interethnic interactions, providing for the joint co-action of subjects on the principles of tolerance.
*Keywords:* tolerance, borderland, the border, sociocultural space, etnogroups, otherness.

УДК 141.78:316.723-053.81(4-15)(476)

**А. І. Смолік**

## ПОСТМАДЭРНІЗМ ЯК МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ СУБКУЛЬТУРЫ ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Анализируется субкультура молодёжи как феномен современного культурного пространства западноевропейских стран и Беларуси. Субкультурные образования молодого поколения возникли во второй половине XX в. в результате поиска отличных от официальной идеологии государственных институтов способов жизнедеятельности. Отмечено, что субкультура молодёжи не укладывается в общепринятую схему, в ней нет явной иерархии и фиксированного центра. Она автономна, временами закрыта и не не претендует на то, чтобы заменить собой культуру общества как данность. Субкультурные образования молодёжи исследуются в контексте парадигмы постмодернизма, которая начатал оформляться в этот же исторический период. Показано, что концепция постмодернизма более всего подходит для выявления сущности, содержания и форм молодёжной субкультуры[1].
*Ключевые слова:* ацентризм, молодёжь, постмодернизм, ризома, субкультура.

Духоўная культура кожнай гістарычнай эпохі характарызуецца пэўнай цэласнасцю і адначасова паўстае перад яе суб’ектамі ў выглядзе складанага спектара тэндэнцый, стыляў, традыцый і маніфестацыі чалавечага духу. На ўсіх этапах культурагенезу у грамадстве ўзнікалі розныя сацыякультурныя ўтварэнні: эзатэрычныя і прафанныя, элітарныя і масавыя, прафесійныя і аматарскія і г. д. Асобныя ўтварэнні культуры адлюстроўвалі дэмаграфічныя, сацыяльныя і прафесійныя яе адметнасці. Унутры розных грамадскіх груп узнікалі спецыфічныя культурныя феномены, сярод якіх важную ролю адыгрывалі субкультуры.

Тэрмін «субкультура» упершыню ў навуковы ўжытак увёў амерыканскі культуролог Т. Розак у 30-е годы XX ст. [1]. У гуманітарных навуках да сённяшняга часу няма адзінага меркавання адносна сэнса і зместу паняцця «субкультура». Так, англійскі культуролог М. Брэйк трактуе субкультуру як «нормы, якія істотна адрозніваюцца ад агульнапрынятай сістэмы каштоўнасцей і якія садзейнічаюць падтрыманню і развіццю калектыўнага стылю жыцця, а таксама адасобленыя ад традыцыйнага стылю, прынятаму ў канкрэтным соцыуме» [2, с. 41]. Па меркаванні Ф. Дэвіса, субкультурай з’яўляецца любая сістэма норм і каштоўнасцей, якая вылучае якую-небудзь сацыяльную групу з вялікай супольнасці [3, с. 131]. На наш погляд, субкультуру неабходна разглядаць як частку ўсёй агульнай культуры, сістэму каштоўнасцей, традыцый, звычаяў, ідэалаў, якія ўласцівы пэўнай сацыяльнай групе соцыума. Субкультуры маюць пэўную трываласць і ў той жа час не аказваюць моцнага ўздзеяння на дамінантную культуру грамадства, яны ўзнікаюць, існуюць пэўны час і паступова зыходзяць, а дамінантная культура захоўваецца. Даследаванне генэзіса субкультур паказвае, што далёка не ўсе страты здольны спараджаць субкульуру, а толькі тыя з іх, якія маюць пэўныя магчымасці. Субкультура ўзнікае ўнутры страты толькі ў тым выпадку, калі на апошнюю не ўплывае сацыяльная эрозія, калі яе не разбураюць рэзкія змены ў сацыяльным атачэнні і экзагамія. Ва ўстойлівай

[1] У артыкулах на беларускай, польскай і ўкраінскай мовах анатацыя дадзена на рускай мове для пашырэння чытацкай аўдыторыі.

страце ў яе нетрах непазбежна ўзнікае і развіваецца субкульура – своеасаблівы канцэнтрат свядомасці ў выглядзе ўласнай карціны свету і вынікаючых з яе спецыфічных норм, каштоўнасцей, сімвалаў, стэрэатыпаў, слэнгаў, этыкета і ўспрыняцця рэчаіснасці.

У еўрапейскім постіндустрыяльным грамадстве, а таксама ў беларускай культурнай прасторы ў другой палове XX ст. пачала фарміравацца такая асобая сфера культуры, як субкультура моладзі. Яна ў пэўнай меры была аўтаномнай, нават закрытай і не прэтэндавала на тое, каб замяніць сабой культуру грамадства як данасць. Яе складванне па часе амаль супала з фарміраваннем новай еўрапейскай парадыгмы – постмадэрнізма як постсучаснага, некласічнага светапогляду. Дадзеная філасофская канцэпцыя нараджалася на аснове адмаўлення стандартызацыі, аднатыпнасці масавай свядомасці, якія былі характэрны для культуры сярэдзіны XX ст. Яго прадстаўнікі Ж. Бадрыяр [5], Р. Барт [4], Ф. Гватары [6], Ж. Дэлёз [6], Ж. Дэрыда [7], Ю. Крысцева [8], Ж. Лакан [9], Ж. Ф. Ліатар [10] і інш. разлядалі свет як тэкст, які напоўнены мноствам сэнсаў На яго, сцвярджалі аўтары канцэпцыі, не распаўсюджваецца адзіны прынцып структурнасці, а сутнасць тэкста вызначаецца кантэкстамі, таму яна бясконца зменлівая. Прачытанне тэктаў культуры магчыма пры дапамозе постамадэрнісцкага падходу – дэканструкцыі. У адпаведнасці з дадзеным метадам, ні аўтар, ні тэкст не павінны навязваць сэнсы чытачу, у сувязі з гэтым усе тэксты неабходна деканструіраваць, г. зн. імкнуцца выявіць у іх значнасць дэталей, якія не заўважаны ці свядома замоўчаны аўтарам і чытачамі.

Ключавым паняццем постмадэрнізма з'яўляецца «інтэртэкстуальнасць». Сутнасць яго: грамадства, культура, свядомасць уяўляюць сабой «інтэртэксты» (міжтэкснасць), якія могуць быць «прачытаны» і «дапісаны». Тэкст свядомасці атрымлівае аўтаномію ад аўтара [8]. Згодна Р. Барту, адбываецца «смерць аўтара», з чаго вынікае «смерць» індывідуальнанага тэкста: усё ўжо было сказана, і магчыма толькі пераінтэрпрэціраваць мінулую культурную спадчыну [4].

Фундаментальная для постмадэрнізма ўстаноўка на прэзумпцыю разбурэння традыцыйных уяўленняў аб структуры як семантычна цэнтрыраванай і стабільна вызначанай сістэмы выражаецца праз паняцце «рызома» (корань). Яно было ўведзена ў 1970-я гг. Ф. Гватары і Ж. Дэлёзам [6], якое яны ўзялі з батанікі. Рызома імі трактавалася не ў якасці лінейнага «стрыжня» ці кораня, але ў якасці радыкальна адметнага ад кораня «клубня», які імпліцытна ўтрымлівае ў сабе «схаваны» парастак. На іх погляд, гэты парастак можа развівацца куды заўгодна і прымаць любыя канфігурацыі. У рызоме адсутнічае выразная структура, а існуе толькі заблытаная каранёвая сістэма. Мноства хаатычна пераплеценых яе парасткаў, адміраючы і зноў вырастаючы, будучы непрадказуемымі, пастаянна ўзаемадзейнічаюць з навакольным асяроддзем.

Для субкультуры еўрапейскай моладзі, на наш погляд, найбольш прыдатнай з'яўляецца рызома. Па-першае, субкультура моладзі не можа існаваць у адрыве ад грамадства, дзе жывуць яе суб'екты. Па-другое, у «рызомным» соцыуме моладзевай субкультуры адсутнічае цэнтралізацыя, упарадкаванне і сіметрыя. Па-трэцяе, субкультура моладзі – феномен, які не ўкладваецца ў агульнапрынятую схему, у яе няма і не можа быць яўнай іерархіі і фіксаванага цэнтра, так як яе суб'екты маюць на мэце адпрацоўку сацыяльных статусаў, што вымагае выкарыстанне як галоўных, так і другасных роляў. Рызома не з'яўляецца механізмам капіравання, а паўстае як карта з мноствам уваходаў. Карта адкрыта, рухома, схільна да змен. Малюнак на карце пастаянна змяняецца, як змяняецца сама рэчаіснасць. Моладзевая субкультура ўзнікае як спроба супрацьстаяць стэрэатыпам масавай свядомасці, стварыць уласную культуру, «знешнюю» у адносінах да дзяржавы і яе свету. Яна не падначальваецца адзінаўладдзю дзяржавы, не прызнае адзінага цэнтра і не ўпісваецца ў маналітную дзяржаўную структуру. Пры гэтым, унутры саміх субкультурных сцэн адбываецца пастаяннае фрагментаванне, вылучэнне новых і новых падвідаў, такіх больш дакладных утварэнняў, якія, захоўваючы сутнасную каштоўнасць, адначасова развіваюць дадатковую асобую якасць, якая іх выдзяляе і робіць адметнымі сярод іншых субкультур.

У першай чвэрці XXI ст. у еўрапескай культурнай прасторы сфарміравалася разнастайная палітра моладзевых субкультур, якія захоўваючы ключавыя і значымыя, ядравыя каштоўнасці, мадэфіцыруюцца, пераламляюцца праз сучасныя сацыякультурныя парадыгмы і рэалізуюцца ў шырокай прасторы еўрапескай моладзі. Так, на аснове глыбокага захаплення музыкальнай культуры сфарміравалася разгалінаваная сетка субкультур (рокеры, металісты, рэперы, транс-культура і інш.). Моладзевыя прыхільнікі сучаснага мастацтва аб'ядналіся ў супольнасці брэйк-дансераў, графіцёраў, прасучасных мастакоў і г. д. Готы, індыяністы, панкі, растманы, хіпі адрозніваюцца сваёй карцінай свету, асаблівым успрыманнем рэчаіснасці. У апошні час у еўрапейскай моладзі набіраюць папулярнасць розныя спартыўныя практыкі і на іх аснове ўзнік шэраг субкультур: байкеры, роллеры, скейтеры, стрыт-байкеры і інш. Інтэнсіўнае развіццё камп'ютэрных тэхналогій спарадзіла субкультуры геймераў, ролявікоў, талкіяністаў, хакераў, юзераў.

Такім чынам, субкультура моладзі не толькі дэцэнтрыравана як сацыякультурная з'ява, але і сама скіравана на дэцэнтрацыю дзяржавы. Зыходзячы з тэндэнцыі дэцэнтрацыі пры даследаванні субкульуры еўрапейскай моладзі, можна абапірацца на фундаментальную ўстаноўку постмадэрнізма – ацэнтрызм. Як адзначаў Ж. Ф. Ліатар, культура постмадэрна, у тым ліку і субкультура не дыферэнцыруецца на культурны цэнтр і так званую перэферыю. У постмадэрнісцкай культуры ўсе мінулыя цэнтры прыцяжэння, створаныя нацыянальнымі дзяржавамі, партыямі, прафесіямі, інстытуцыямі і гістарычнымі традыцыямі, губляюць сваю сілу [9]. У рамках моладзёвых субкультур, нягледзячы на эзатэрычнасць і закрытасць асобных субкультурных утварэнняў, абазначаныя паміж імі межы сціраюцца. У іх адсутнічае цэнтр. У выніку субкультуры моладзі і дыферэнцыруюцца, і інтэгрыруюцца, ствараючы тым самым несістэмныя адрозненні, няздольныя дакладна супрацьпастаўляцца адзін аднаму, што не

прыводзіць да бінарных апазіцый. Напрыклад, панкі не знаходзяцца ў апазіцыі да хіпі, апошнія люберам, тыя байкерам і г. д.

Безумоўна, абазначаныя субкультурныя ўтварэнні не вычэрпваюць увесь спектр субкультурнага руху еўрапейскай моладзі. Субкультуры ўвесь час знаходзяцца ў дынаміцы: у адных назіраецца згасанне субкультурнай актыўнасці, іншыя яшчэ не аформіліся ў поўнай меры ў цэласную структурную сістэму. Большасць сучасных субкультур губляе сваю эзатэрычнасць, што было ўласціва ім на раннім этапе развіцця. Сёння асаблівы інтарэс уяўляюць грамадска-палітычныя і сацыяльна-актыўныя субкультуры моладзі, дзейнасць якіх скіравана на захаванне прыроднай і культурнай разнастайнасці. Пацыфістскія і экалагічныя праблемы прыцягваюць у шэрагі такіх суполак усё большую колькасць маладого пакалення.

Аналіз субкультурных утварэнняў у беларускім грамадстве сведчыць, што на мяжы XX–XXI стст. працэсы субкультурызацыі таксама інтэнсіўна развіваліся ў асяроддзі моладзі. Падчас трансфармацыі палітычнай, эканамічнайі і сацыякультурнай сфер, пад уздзеяннем дэструктыўных механізмаў узнік ідэалагічны вакуум, калі сацыялістычныя ідэалы і каштоўнасці не маглі ўжо адэкватна выражаць інтарэсы і патрэбы маладога пакаленння. Ва ўмовах узмацнення міжкультурнай камунікацыі, адкрытай сусветнай прасторы складваліся спрыяльныя абставіны для трансляцыі каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і традыцый заходнеўрапейскай культуры ў свядомасць беларускай моладзі. У выніку акумуліраванага і ўстойлівага нацыянальнага культурнага досведу і цывілізацыйнага ўплыву еўрапейскага грамадства ў моладзі нашай краіны хутка складвалася новая структура культурных каштоўнасцей, сімвалаў, узораў і кодаў, якія сталі асновай розных субкультур.

Параўнальны аналіз субкультурнага руху ў Беларусі і краінах Заходняй Еўропы выявіў пэўныя яго адметнасці. Так, дзейнасць суб’ектаў беларускіх моладзевых субкультур галоўным чынам скіравана альбо на правядзенне вольнага часу, альбо на атрыманне інфармацыі і яе трансляцыю. У адрозненнеі ад сваіх еўрапейскіх аднагодкаў беларуская моладзь, на наш погляд, яшчэ недастаткова ўключана ў розныя сацыяльныя праграмы (валанцёрства, экалогія, дапамога інвалідам, хворым і інш.). Думаецца, што такія адрозненні звязаны з арганізацыйна-структурнай перабудовай руху беларускай моладзі, з станаўленнем і развіццём грамадскіх арганізацый моладзі, працэсам станаўлення новых субкультурных моладзевых аб’яднанняў. Тым не менш ёсць падставы меркаваць, што ва ўмовах мадэрнізацыі беларускага грамадства субкультура моладзі будзе важным фактарам эвалюцыйнага абнаўлення соцыума, яго перахода ў больш плюралістычную, талерантную, адкрытую еўрапейскую прастору.

Такім чынам, існаванне субкультур еўрапейскай і беларускай моладзі як і філасофіі постмадэрна ёсць вынік прызнання наяўнасці мноства пунктаў гледжання, паліфоніі култырнага свету. У ім столькі разнастайнасцей, колькі ўяўленняў аб ёй, і ўсе яны роўнапраўныя. Паколькі сэнс ужо не з’яўляецца пытаннем агульнапрызнанай рэчаіснасці, то і нараджаецца наратыўны хаос, якому садзейнічае вытворны ад прынцыпа ноніерархіі прынцып нонселекцыі. Дзякуючы яму складваюцца фрагменціраваныя, разарваныя, хаатычныя, нават часам адарваныя ад дамінантнай культуры, пазбаўленныя сэнса, заканамернасцей і упарадкаванасці моладзевыя субкультуры. Яны эклетктычны, так як упітваюць у сябе не гарманічныя, нават супрацьлеглыя элементы, якія спакойна суіснуюць і ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго. Усё вышэйсказаннае дазваляе сцвярджаць, што асноўныя прынцыпы метадалогіі постмадэрна плённы для даследавання такіх сацыякультурных феноменаў, як субкультуры заходнееўрапейскай і беларускай моладзі.

*Спіс літаратуры*

1. Roszak, Th. The making of counter-culture: Reflections on the technocratic society and its youthful oppositions / Th. Roszak. – New York, 1969. – 617 p.
2. Brake, M. Cultural revolution or alternative delinquency: an examination of deviant youth as a social problem / M. Brake // Contemporary social problems in Britain / ed by R. Bailey, I. Young. – Lexington (Mass.), 1973. – P. 33–50.
3. Davis, F. On youth subcultures: The hippie variant / F. Davis. – New York : General Learning Press, 1971. – 723 p.
4. Барт, Р. Избранные работы: семиотика: поэтика / Р. Барт. – М. : Прогресс, 1989. – 616 с.
5. Бодрийяр, Ж. Система вещей / Ж. Бодрийяр. – М. : Рудомино, 1995. – 337 с.
6. Делез, Ж. Капитализм и шизофрения / Ж. Делез, Ф. Гваттари // Анти-Эдип: Специализир. информ. по общеакад. прогр. «Человек, наука, о-во: комплекс. исслед». : [сокр. пер.-реф.]; АН СССР, ИНИОН, Всесоюз. межвед. центр наук о человеке (при Президиуме АН СССР). – М. : ИНИОН, 1990. – 107 с.
7. Деррида, Ж. О грамматологии / Ж. Деррида. – М. : Ad Marginem, 2002. – 511 с.
8. Деррида, Ж. Письмо и различие / Ж. Деррида. – СПб. : Акад. проект, 2000. – 428 с.
9. Кристева, Ю. Разрушение поэтики / Ю. Кристева // М. М. Бахтин: pro et contra. Творчество и наследие М. М. Бахтина в контексте мировой культуры. Том II / Сост. и коммент. К. Г. Исупова; библиография О. С. Осьмухиной, Т. Г. Юрченко, О. Е. Оссовского, Н. Б. Паньковой. – СПб. : РХГИ, 2002. – 712 с.
10. Лакан, Ж. О бессмыслице и структуре Бога / Ж. Лакан // Консультативная психология и психотерапия. – 2002. – № 1. – С. 36–50.
11. Лиотар, Ж. -Ф. Состояние постмодерна / Ж.-Ф. Лиотар. – СПб. : Алетейя, 1998. – 159 с.

***Аляксандр Іванавіч Смолік***, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

**Alexander Smolik**
Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, The Republic of Belarus
e-mail: kafkult@buk.by

POSTMODERNISM AS THE METHODOLOGY OF THE STUDY OF THE YOUTH SUBCULTURE IN WESTERN EUROPE AND BELARUS

The article analyzes the youth sub-culture as a phenomenon of the modern cultural space of Western European countries and Belarus. Subcultural formations of the young generation emerged in the second half of the twentieth century as a result of search for alternative ways of life that were

different from the official ideology of the state institutions. It is noted that the subculture of youth does not fit into the generally accepted scheme, it does not have an explicit hierarchy and a fixed center. It is autonomous, sometimes closed and is not intended to replace the culture of the society as given. Subcultural formations of youth are studied in the context of the paradigm of postmodernism, which also began to take shape in the same historical period. It is shown that the concept of postmodernism is most suitable for identifying the essence, content and forms of youth subculture.

*Keywords*: acentrism, youth, postmodernism, rhizome, subculture.

УДК 316.356

**Н. С. Аветян**

## СОЦИОЛОГИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ СОЦИАЛЬНОЙ И КУЛЬТУРНОЙ АДАПТАЦИИ НАЦИОНАЛЬНОЙ ДИАСПОРЫ В ПРИНИМАЮЩЕМ СООБЩЕСТВЕ

Автором рассмотрены методологические основы изучения процессов адаптации мигрантов к условиям другой социокультурной среды и их последующей интеграции. Важнейшими задачами, возникающими перед мигрантами, являются, с одной стороны, стремление сохранить свою национальную идентичность и национальное самосознание, с другой – найти и занять свое положение в социальном пространстве принявшей страны.

*Ключевые слова:* адаптация, интеграция, мигранты, методология.

Процесс адаптации мигрантов к условиям другой социокультурной среды и их последующей интеграции достаточно сложен и многоаспектен. Попадая в иную, новую для себя социальную среду, мигранты чувствуют себя потерянными, поскольку меняются не только этнокультурные, но и географические, экологические и климатические условия существования. Нарушается динамическое равновесие между внутренними устоявшимися нормами, правилами и моделями поведения и внешними требованиями со стороны принимающей среды. Противоречивость адаптации и последующей интеграции заключается в том, что одни стороны социальной адаптации и интеграции мигрантов на новом месте могут быть успешными и удовлетворять как их, так и принимающее сообщество, а другие нет, что в перспективе может повлечь за собой определенные противоречия и конфликтные ситуации как со стороны мигрантов, так и со стороны принимающей среды. В случаях, когда отдельный индивид либо группа под давлением тех или иных обстоятельств оказываются оторванными от привычного для них места и образа жизни, где они занимали определенное положение и выполняли определенные социальные роли, возникает необходимость приспособления.

Адаптация мигрантов к инокультурному окружению и их последующая интеграция в новую среду не только происходит в виде стихийного неуправляемого процесса, но и может сопровождаться целенаправленным воздействием на него со стороны государства, окружающей среды, специально созданных организаций (диаспор), которые оказывают прямое влияние на их адаптивные возможности. Возможно также и сочетание двух способов адаптации и интеграции. Однако преувеличивать значимость данных структур не следует, так как адаптант представляет собой личность с уже сложившимися социальными и жизненными ориентациями, накопленным социальным капиталом и целевыми установками. Воздействие диаспоры (общины) оказывает относительно контролируемое влияние на мигрантов и выступает как механизм взаимодействия адаптанта и окружающей среды.

Процесс социокультурной адаптации и интеграции мигрантов в принимающее сообщество проходит несколько стадий. Первая – это стадия «культурного шока», который испытывает мигрант либо группа людей в результате вынужденной смены места жительства под влиянием ряда факторов. Вторая стадия – начало активных взаимодействий мигрантов с местным окружением. Третья – стадия интеграции, характеризующаяся не просто приспособлением мигранта либо группы к принимающей его среде, но и вписывание в социальное, экономическое, политическое и культурное пространство принявшей страны.

Важнейшими задачами, возникающими перед мигрантами, являются, с одной стороны, стремление сохранить свою национальную идентичность и национальное самосознание, с другой – найти и занять свое положение в социальном пространстве принявшей страны.

В социологии не существует на сегодняшний день единой теории адаптации и интеграции. Данные понятия в русле каждой социологической парадигмы трактовались исследователями по-разному в зависимости от методологического подхода.

В связи с необходимостью всестороннего изучения феномена адаптации и интеграции мигрантов большое значение имеет использование структурно-функционального подхода, применение которого раскрывает особенности процесса вхождения мигранта в новую среду, а также позволяет выявить степень согласования целей и интересов, которые ставят перед собой мигранты, с функциями и структурой принимающего сообщества. Адаптация описывается как процесс установления соответствия между характеристиками индивида либо группы и существующими нормами принимающей среды, в которую они попадают. Нормы среды представляются в виде постоянной величины, которые являются мерилом оценки успешности-неуспешности адаптации мигрантов и последующей их интеграции.

Э. Дюркгейм утверждал, что массовые миграции оказывают существенное влияние на социальные трансформации, происходящие в обществе, поскольку мигранты либо выполняют устойчивые социально значимые функции принимающего сообщества, либо вызывают дисбалансные состояния и конфликты. Адаптация, по Э. Дюркгейму, представляет собой процесс усвоения адаптантом либо группой социальных норм с их последующей интеграцией. Влияние социальных норм на поведение мигрантов, по мнению ученого, происходит под влиянием социальных фактов, которые обладают такими важными признаками, как объективность, не зависящая